# ЯКАЎ БРАЙЦАЎ — ПЕРШЫ ПІСЬМЕННІК НАШАГА КРАЮ

Знаёмячыся з трэцім томам «Дакументаў і матэрыялаў па гісторыі Беларусі. 1900—1917 гг.», я звярнуў увагу на прашэнне сялян вёскі Запруды Клімавіцкага павета цару Мікалаю II. Датавана яно 25 ліпеня 1904 года. У ім смела, з болем у сэрцы выкладзена сялянскае жыццё і просьба аб канфіскацыі з уладанняў памешчыцы Какашынскай участка зямлі, які належыў сялянам па выкупных актах. Напісаў прашэнне па просьбе сялян Якаў Раманавіч Брайцаў.

І хоць яно было адхілена царом, аднак дакументы захавалі смеласць аўтара, першага пісьменніка нашага краю супраць несправядлівасці і панскага самавольства. Больш падрабязней даведаўся пра Брайцава, праўдзівей кажучы, з яго літаратурнай спадчынай, праз Івана Іванавіча Кісялёва, кіраўніка гуртка юных краязнаўцаў Забялышынскай школы. Якаў Раманавіч Брайцаў нарадзіўся ў 1861 годзе ў вёсцы Забялышына ў сялянскай сям'і.

Першапачатковую грамату сялянскі хлапчук атрымаў спачатку ў роднай вёсцы, потым скончыў павятовае вучылішча ў Клімавічах. Вучыўся выдатна, вельмі любіў чытаць рускую літаратуру. Пасля вучобы юнак некаторы час працуе памочнікам пісара валаснога ўпраўлення ў Забялышыне. У васемнаццаць год едзе на заработкі на цукровыя заводы Украіны, дзе працуе канторшчыкам.

перыяд Якаў Брайцаў піша «Бацькі. Аповесць з беларускага простанароднага жыцця», якая выйшла з друку ў 1889 годзе (надрукавана ў друкарні Кушнярова і мела аб'ём 103 старонкі). У аповесці аўтар паказаў жыццё сялянства ў пасляпрэформеннай вёсцы на Клімаўшчыне.

Акадэмік Е. Ф. Карскі адзначыў гэты твор, як «таленавітую аповесць». Адначасова Брайцаў піша рад аповесцей. «Няўдачніца Анюта», «Старая вёска» і іншыя, у якіх паказана жыццё і вобразы роднай вёскі і павятовага горада Клімавічы ў 1870-гадах. Апісваючы гаротнае жыццё сялян, несправядлівасць, пісьменнік вялікую надзею ўскладае на будучае.

Па сваёй натуры Брайцаў быў шукаючым чалавекам і пасада бухгалтара яго не задавальняла. Ён пазнаёміўся з рускімі пісьменнікамі, часта наведваў Льва Талстога, які аказаў вялікі ўплыў на фарміраванне яго філасофскага светапогляду ў сэнсе адмаўлення існуючага правапарадку. Вынікам гэтага знаёмства паяўляецца апавяданне пад назвай «Цуда», якое аўтар назваў псіхалагічным эцюдам.

Разам з тым пісьменнік займаецца кветкаводствам, становіцца адвакатам, адкрывае магазін на продажу кветак. Аднак на гандлёвай ніве не пашанцавала. У 1900 годзе Брайцаў вяртаецца ў Забялы-

за выкананне самых заблытаных спраў. І Якаў Раманавіч заўсёды выступаў у абарону інтарэсаў сялянства. Больш вядомага чалавека не было ва ўсім Клімавіцкім павеце чым Брайцаў. Таму не дзіўна, што сяляне давяралі яму ўсе свае патаемныя думкі, дзяліліся горам. Сведчаннем гэтага з'явілася прашэнне сялян вёскі Запруды цару.

У перыяд рэвалюцыйных падзей 1905 года Брайцаў падвяргаецца вобыскам, у яго была знойдзена нелегальная літаратура. Якаў Рамнавіч знаходзіўся пад наглядам паліцыі. У гэты час ім была напісана камедыя «Бяда цыгана», у якой расказваецца пра падзеі ў глухой мясцовасці Беларусі. У 1913—1916 гадах Брайцаў напісаў вялікі раман «Сярод балот і лясоў», у якім апісвае жыццё сялян беларускіх вёсак Забялышына, Родні, Галіч, Старай Буды, Хоцімска, горада Клімавічы ў перыяд першай рускай рэвалюцыі. На жаль, раман пасля смерці пісьменніка не захаваўся, засталіся толькі фрагменты.

Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 года Брайцаў працуе спачатку сакратаром Забялышанскага валаснога выканкома, потым Клімавіцкага павятовага выканкома. І нарэшце займае пасаду павятовага пракурора. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі працуе ў Клімавіцкім павятовым выканкоме. У наступныя гады ў сувязі з пагоршан-

У 1925—1926 гадах зноў займаецца літаратурнай дзейнасцю. Ён піша аповесць «Гаспадар», у якой крытыкуе прыватніцкую сялянскую гаспадарку, дасылае свае карэспандэнцыі ў «Крестьянскую газету». Спрабуе пісаць вершы і паэмы. Так ім была напісана паэма «Дудка», дзе аўтар выказвае радасць з выпадку устанаўлення Савецкай улады ў Беларусі. Якаў Раманавіч Брайцаў быў прыняты ў члены Усерасійскага саюза сялянскіх пісьменнікаў. Памёр ён у 1931 годзе, будучы цяжка хворым. Пахаваны пісьменнік на сельскіх могілках сярод сваіх аднавяскоўцаў, якіх ён так любоўна апісваў у сваіх творах.

Юныя краязнаўцы Забялышанскай школы сабралі многа матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці першага пісьменніка нашага раёна. Іх з цікавасцю чытаюць не толькі навучэнцы школы, а і хлебаробы саўгаса «Трасціно».

**М. Ласоўскі,**
**загадчык Трасцінскай сельскай бібліятэкі.**

Из газеты «Новае жыццё» № 34

нічыкам. Тут ён напісаў сваё першае апавяданне «Дударева лапа».

У пошуках шчасця пераязджае ў Маскву. Там ён займаецца самаадукацыяй. У гэты

шана, займаецца сельскай гаспадаркай.

З часам ён сапраўды набыў славу адваката па сялянскіх справах. У яго выяўляецца аратарскі талент і здольнасць

нем стану здароўя Брайцаў пераязджае ў Забільшчана. Спачатку ўладкоўваецца ў сельскі Савет, потым пераходзіць выкладчыкам земляробства ў школу сялянскай моладзі.

**Ласоўскі, М.** Якаў Брайцаў — першы пісьменнік нашага краю : [аб Я. Р. Брайцаве] / М. Ласоўскі // Новае жыццё. — 1966. — 19 сакавіка.